УДК 904.4(476.1)“634/653” DOI: 10.37445/adiu.2020.02.14

*М. А. Плавінскі*

# ШМАТКУЛЬТУРНАЕ ПАСЕЛІШЧА КАСТЫКІ ІІ У ВЯРХОЎЯХ ВІЛІІ: МАТЭРЫЯЛЫ ДАСЛЕДАВАННЯЎ 1973, 2016 І 2018 гг.

*Паселішча Кастыкі ІІ з’яўляецца часткай археалагічных помнікаў Кастыкі Вілейскага р-на Мінскай вобл. Ён знаходзіцца ў вярхоўях ракі Віліі, на яе правым беразе, за 2,5 км ад упадзення ў яе р. Сэрвач. На падставе аналізу матэрыялаў раскопак 1973, 2016 і 2018 гг., можна меркаваць, што шматкультурнае паселішча Кастыкі ІІ існавала ўжо ў эпоху позняга неаліту і пачатку эпохі бронзы. У культурным слаі паселішча выяўлены посуд позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі і другой чвэрці І тыс. н. э., а таксама рэчавы і керамічны наборы, характэрныя для банцараўскай культуры трэцяй чвэрці І тыс. н. э.*

***Ключавыя словы**: шматкультурнае паселішча, позні этап культуры штрыхаванай керамікі, банцараўская культура.*

**Месцазнаходжанне і гісторыя вывучэння комплекса археалагічных помнікаў Кастыкі.** Шматкультурнае паселішча Кастыкі ІІ з’яўляецца часткай комплекса археалагічных помнікаў Кастыкі Людвіноўскага сельскага савета Вілейскага раёна Мінскай вобласці. У склад гэтага комплекса археалагічных помнікаў уваходзіць таксама курганны могільнік старажытнарускага часу.

Пачатак вывучэння комплекса археалагічных помнікаў Кастыкі прыпадае на сярэдзіну XIX ст., калі тут адбыліся першыя раскопкі, ажыццёўленыя К. П. Тышкевічам. У 1856 г. ён раскапаў тут адзін курган, часткова разбураны ў выніку падмывання берага водамі Віліі, але не выявіў у ім ні рэштак пахавання, ні інвентару (Tyszkiewicz 1871, s. 44—45).

Курганны могільнік знаходзіцца ў вярхоўях ракі Віліі, на яе правым беразе, за 2,5 км ад упадзення ў яе ракі Сэрвач (мал. 1). Могільнік размяшчаецца ва ўсходняй частцы вёскі Кастыкі на ўсход ад праваслаўнай царквы ў імя Святых Сарака Севасційскіх пакутнікаў (збудаваная ў 1756 г.) і прылеглых да яе дзеючых могілак. Пры гэтым, сёння могілкі ўшчыльную набліжаюцца да курганоў.

На сённяшні дзень курганны могільнік займае дастаткова роўную пляцоўку памерам 110—120 м з захаду на ўсход на 25—30 м з поўначы на поўдзень. Із захаду тэрыторыя могільніка абмежаваная дзеючымі могілкамі пры царкве, з усходу — неглыбокім зарослым дрэвамі ярам, з поўначы — грунтавой дарогай, якая адначасова з’яўляецца вуліцай вёскі Кастыкі, з поўдня і паўднёвага ўсходу — карэнным берагам ракі Вілія (мал. 2).

У 1973 г. раскопкі курганнага могільніка Кастыкі былі праведзены Я. Г. Звяругам. Даследаванні ажыццяўляліся ў межах вывучэння археалагічных помнікаў зоны затаплення Вілейскага вадасховішча, хаця сам могільнік і не мусіў патрапіць пад ваду. Я. Г. Звяруга зняў план могільніка і раскапаў 7 пахавальных нысыпаў (мал. 3) з 20 захаваных на той момант (на знятым плане курганы атрымалі скразную нумарацыю ад 1 да 20; Зверуго 1974, с. 2—7).

Я. Г. Звяруга неаднаразова звяртаўся да публікацыі матэрыялаў раскопак у Кастыках. Звесткі аб даследаваннях 1973 г. былі часткова прыведзены ў яго манаграфіі 1989 г., прысвечанай старажытнасцям Верхняга Панямоння (Зверуго 1989, рис. 57—59). У 2001 г. даследчык выдаў артыкул, прысвечаны курганным могільнікам вярхоўяў Віліі. У гэтай працы ён падрабязна апісвае будову пахавальных насыпаў у Кастыках і выяўлены ў іх інвентар (Звяруга 2001, с. 173—175, мал. 1—4). Апошні раз да публікацыі матэрыялаў раскопак некропаля ў Кастыках Я. Г. Звяруга звярнуўся

© М. А. ПЛАВІНСКІ, 2020




**Мал. 1.** Комплекс археалагічных помнікаў Кастыкі на мапе Беларусі




**Мал. 2.** Комплекс археалагічных помнікаў Кастыкі (здымак з Google)

ў манаграфіі 2005 г., прысвечанай старажытнасцям Беларускага Павілля жалезнага веку і эпохі ранняга Сярэднявечча (Звяруга 2005, с. 134—139, мал. 91—93).

На падставе аналізу пахавальнага інвентара і абрада даследаваных у Кастыках насыпаў, Я. Г. Звяруга датаваў час функцыянавання могільніка ў межах XI—XII стст. (Звяруга 2001, с. 175). Паўторная апрацоўка матэрыялаў даследаванняў 1973 г., ажыццёўленая аўтарам сумесна з М. І. Сцяпанавай, дазволіла звузіць датаванне некропаля да сярэдзіны XI—XII стст. Можна меркаваць, што ён належаў групе жыхароў Полацкай зямлі, якая ажыццяўляла пахаванні па абрадзе інгумацыі на аснаванні насыпаў, скіраваныя галовамі на захад. Гэта, у сваю чаргу, дазваляе думаць, што члены старажытнага калектыву, якія пакінулі некропаль у Кастыках, мелі пэўнае ўяўленне аб хрысціянскай пахавальнай абраднасці (Плавінскі, Сцяпанава 2019, с. 127—129).

Пытанне аб існаванні на беразе Віліі паселішча, якое папярэднічала ўзнікненню старажытнарускага некропаля, паўстала ўжо перад Я. Г. Звяругам. У працэсе раскопак кургана 17 ён выявіў, што «*у насыпе, пачынаючы з самай яго вяршыні, траплялася дастаткова шмат фрагментаў керамікі. Пераважалі фрагменты ляпных пасудзін, але сустракаліся і кругавыя, у тым ліку позкія. Відаць, частка керамікі аказалася ў насыпе пры ўзвядзенні кургана (верагодна, паблізу знаходзілася селішча). Другая частка была закінута ў снарадную варонку ўжо ў нядаўні час*» (Зверуго 1974, с. 8—9; Звяруга 2001, с. 175). Падрабязнае апісанне выяўленай керамікі Я. Г. Звяругам ажыццёўлена не было, гэтаксама як і яе замалёўка. Выявіць месца захавання кераміч-




**Мал. 3.** План курганнага могільніка Кастыкі з пазначэннем раскопаў і шурфоў 2016 г. (раскопы І і ІІ, шурфы І і ІІ) і 2018 г. (шурф ІІІ)

най калекцыі з раскопак кургана 17 не атрымалася.

Акрамя таго, асобныя артэфакты, не звязаныя з пахавальнымі комплексамі, былі выяўлены ў насыпах курганоў 1, 3 і 5 (Зверуго 1974, с. 2—5; Звяруга 2001, с. 173—174). Аднак, нягледзячы на гэтыя факты, да пэўнай высновы аб існаванні адкрытага паселішча на тэрыторыі некропаля Я. Г. Звяруга так і не прыйшоў, наколькі аб гэтым можна меркаваць з яго тэкстаў.

У 2016 г. раскопкі ў Кастыках былі аднаўленыя археалагічнай экспедыцыяй пад кіраўніцтвам аўтара. Асноўнымі мэтамі новага этапу даследаванняў былі: удакладненне тапаграфіі могільніка, характару будовы пахавальных насыпаў і выяўленне наяўнасці пад курганамі культурнага слою. У выніку прац, праведзеных у 2016 г., была даследавана агульная плошча 166 м$^2$ (раскопы І і ІІ, шурфы І і ІІ; мал. 3) і вывучаны курган 4 (паводле нумарацыі Я. Г. Звяругі), які змяшчаў пашкоджанае пахаванне па абрадзе інгумацыі. Із прычыны таго, што тэрыторыя некропаля даследавалася суцэльнай плошчай, было вызначана, што ён размяшчаецца на месцы шматслойнага паселішча, з культуранага слоя якога і насыпаліся курганы (Плавінскі 2017а; Pławinski 2017). У 2018 г. у Кастыках быў дадаткова закладзены шурф ІІІ плошчай 12 м$^2$ (мал. 3). Яго распрацоўка ажыццяўлялася з мэтай удакладнення межаў распаўсюджання культурнага слою паселішча і яго датавання.

Шматслойнае паселішча Кастыкі ІІ атрымала свой парадкавы нумар з прычыны таго, што каля вёскі Кастыкі маецца яшчэ адно паселішча, вядомае ў археалагічнай літаратуры як «Кастыкі І». Паселішча Кастыкі І знаходзіцца за 1 км на паўднёвы захад ад вёскі Кастыкі, на правым беразе Віліі пры ўпадзенні ў яе Сэрвачы. Яно было выяўлена ў 1972 г. падчас абследавання тэрыторыі будаўніцтва Вілейскага вадасховішча. У 1973 г. Міх. М. Чарняўскі заклаў тут раскоп плошчай 160 м$^2$. У выніку праведзеных даследаванняў было выяўлена, што дзюнападобнае ўзвышша каля берага Віліі было ўпершыню заселена ў сярэднім неаліце носьбітамі ўсвяцкай археалагічнай культуры. У эпоху сярэдняй бронзы тут жыло насельніцтва паўночнай перыферыі тшцінецкага кола культур з уплывам (альбо рэшткамі) паўночнабеларускай культуры. Пазней, у канцы бронзавага і ў жалезным веку, на паселішчы Кастыкі І пражывалі носьбіты культуры штрыхаванай керамікі. Пэўная гаспадарчая актыўнасць працягвалася тут і ў старажытнарускую эпоху, і ў Новы час (Чарняўскі 2006, с. 31—38).

**Шматкультурнае паселішча Кастыкі ІІ: матэрыялы раскопак 1973 г.** Як ужо было адзначана, у працэсе даследавання курганных насыпаў у 1973 г. Я. Г. Звяругам быў выяўлены шэраг артэфактаў, не звязаных з пахавальны-

Курганны могільнік Кастыкі, 1973 г. Артэфакты, не звязаныя з пахавальнымі комплексамі

| № кургана | Месца выяўлення ў насыпе | Апісанне артэфакта | Мал. |
|---|---|---|---|
| 1 | У паўднёва-ўсходнім сектары | Каменнае цясла | — |
| 3 | У паўднёвай перамычцы | Фрагмент глінянага праселка | 4: 1 |
| 5 | Непадалёк ад цэнтра кургана | Глінянае праселка | 4: 2 |
| 17 | • *«У насыпе, пачынаючы з самай яго вяршыні»* | *«Дастаткова шмат фрагментаў керамікі… Пераважалі фрагменты ляпных пасудзін, але сустракаліся і кругавыя, у тым ліку позні»* | — |
| | • у паўднёвай перамычцы | • глінянае праселка | 4: 3 |
| | • у паўднёвай перамычцы | • жалезнае шыла | 4: 4 |
| | • на аснаванні | • фрагмент гінянага праселка | — |
| | • на аснаванні | • жалезная ігла | 4: 5 |
| | • на аснаванні | • лязо нажа | 4: 6 |
| | • непадалёк ад краю насыпу | • фрагмент тачыльнага бруска | 4: 7 |
| | • непадалёк ад краю насыпу | • фрагмент тачыльнага бруска | 4: 8 |

мі комплексамі (табліца). Не ўсе гэтыя знаходкі былі замаляваныя альбо сфатаграфаваныя падчас падрыхтоўкі справаздачнай дакументацыі, а пасля перададзеныя на пастаяннае захаванне ў музейныя зборы [1]. Нягледзячы на гэта, можна меркаваць, што выяўленыя артэфакты належаць да розных храналагічных перыядаў.

Найбольш старажытным з выяўленых прадметаў, верагодна, з'яўляецца каменнае цясла, знойдзенае ў паўднёва-заходнім сектары насыпу кургана 1. Знаходка была перададзена Міх. М. Чарняўскаму, які пэўны час браў удзел у раскопках у Кастыках (Зверуго 1974, с. 3; Звяруга 2001, с. 173). Нягледзячы на адсутнасць выявы самога артэфакта, можна выказаць самыя агульныя меркаванні аб яго магчымым датаванні. Каменныя цяслы былі шырока распаўсюджаны ў неаліце і ў эпоху бронзы, але іх выкарыстанне працягвалася і ў раннім жалезным веку (Егорейченко 2006, с. 28—29).

Астатнія індывідуальныя знаходкі з насыпаў курганоў належаць да больш позняга часу (табліца). Найбольшую каштоўнасць для вызначэння храналогіі паселішча, якое папярэднічала функцыянаванню некропаля, маюць знаходкі гліняных праселак. Два з іх — фрагмент з насыпа кургана 3 (мал. 4: 1) і цэлае праселка са слядамі другаснага абпалу з кургана 17 (мал. 4: 3) належаць да тыпу біканічных. Распаўсюджанне такіх праселак у побыце насельніцтва культур лясной зоны пачынаецца з позназарубінецкага перыяда (Лопатин, Фурасьев 2007, с. 55), хаця час іх найбольш шырокага распаўсюджання прыпадае на трэцюю чвэрць I тыс. н. э. (Митрофанов 1978, с. 114;

1. Асноўная частка археалагічнай калекцыі з раскопак 1973 г. у Кастыках захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь (НГМ РБ, КП 31713), у той час як у Вілейскі краязнаўчы музей быў перададзены толькі кругавы гаршчок з кургана 11 (ВКМ, КП 5982).




**Мал. 4.** Кастыкі 1973 г. Матэрыялы з культурнага слоя паселішча, выяўленыя ў насыпах курганоў: *курган 3*: 1 — фрагмент глінянага приселка; *курган 5*: 2 — глінянае праселка; *курган 17*: 3 — глінянае приселка; 4 — жалезнае шыла; 5 — жалезная ігла; 6 — лязо жалезнага нажа; 7, 8 — каменныя тачыльныя брускі (1—6, 8 — мал. М. І. Сцяпанавай, 7 — мал. Я. Г. Звяругі)

Михайлова 2014, с. 159; Шадыра 2006, с. 80). Варта адзначыць, што ў паўночнай Беларусі, у прыватнасці, у арэале культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў, выкарыстанне біканічных гліняных праселак працягвалася да самага канца I тыс. н. э. (Енуков 1990, с. 72) і нават да пачатку XI ст. (Плавінскі 2017b, мал. 36: 5). У рэгіёне Верхняга Павілля знаходкі біканічных праселак могуць атаясамліваецца са старажытнасцямі банцараўскай археалагічнай культуры, чыё дадаванне вызначаецца ў межах V—VIII стст. (Митрофанов 1978, с. 114, 152—153; Шадыра 1999, с. 374—375). Трэцяе праселка, знойдзенае ў насыпе кургана 5, мае дыскападобную форму (мал. 4: 2) і можа быць датаванае ў шырокіх межах другой паловы I тыс. н. э. (Шадыра 1999, с. 374—375).

Вузкае датаванне астатніх знаходак, якія былі выяўленыя падчас даследавання кургана 17, — шыла, ігла, лязо нажа і два фрагменты тачыльных брускоў (мал. 4: 4—8) — не ўяўляецца магчымым. Разам з тым, цалкам відавочна, што яны належаць да часу не раней за мяжу I тыс. да н. э. — I тыс. н. э. — эпохі, калі ў побыце насельніцтва культуры штрыхаванай керамікі Беларускага Панямоння шырока распаўсюджваюцца разнастайныя металічныя вырабы (Егорейченко 2006, с. 79; Митрофанов 1978, с. 42; Мядзведзеў 1996, с. 51). Такому меркаванню не супярэчыць і наяўнасць у насыпе кургана 17 фрагментаў ляпнога посуду.

Выяўленне такой значнай колькасці розначасовых артэфактаў у насыпах курганоў, на мой погляд, не пакідае сумненняў у тым, што яны былі ўзведзены з культурнага слою паселішча, які ўтрымліваў розначасовыя матэрыялы. Наяўнасць раўчукоў вакол чатырох з сямі даследаваных курганоў сведчыць аб тым, што яны цалкам ці часткова насыпаліся з грунту, узятага на месцы. Гэта, у сваю чаргу, дазваляе меркаваць, што на беразе Віліі, дзе ў сярэдзіне XI—XII стст. функцыянаваў курганны могільнік, да таго існавала адкрытае паселішча Кастыкі II.

Аб тым, што курганы могільніка Кастыкі насыпаныя з культурнага слою, сведчыць і іх стратыграфія. Усе даследаваныя насыпы складаліся з праслоек пяску розных адценняў — чыстага жоўтага пяску і гумусаванага пяску шэрага ці цёмна-шэрага колераў (Зверуго 1974, с. 2—9; Зваруга 2001, с. 173—175).

**Шматкультурнае паселішча Кастыкі II: матэрыялы раскопак 2016 і 2018 гг.** На момант аднаўлення даследаванняў могільніка Кастыкі ў 2016 г. у некропалі захаваліся ўсе 20 насыпаў, улічваючы 7 курганоў, адноўленых Я. Г. Зваругам у 1973 г. Стан захаванасці насыпаў можна прызнаць задавальняючым, хаця частка з іх, відавочна, дастаткова сур'ёзна пашкоджана перакопамі. Варта таксама адзначыць, што сёння паўночна-ўсходняя частка могільніка паступова зарастае дрэвамі, што, натуральна, шкодзіць стану захаванасці насыпаў.

У працэсе даследаванняў у Кастыках у 2016 г. намі быў узяты за аснову план могільніка, зняты Я. Г. Зваругам у 1973 г. (мал. 3). Вывучэнне тэрыторыі комплекса археалагічных помнікаў у 2016 г. ажыццяўлялася шляхам распрацоўкі раскопаў і шурфоў, якія ўключалі не толькі насыпы курганоў і прылеглыя да іх раўчукі, але і міжкурганную прастору (мал. 5).




**Мал. 5.** Кастыкі 2016 г., мадэль дзённай паверхні курганоў 4 і 5 (раскопы I, II, шурфы I, II) і прылеглай да іх тэрыторыі ў гарызанталях, гарызанталі праведзены праз 0,05 м (мал. Э. А. Астаповіча)




**Мал. 6.** Кастыкі 2016 г. Профілі кургана, **ўмоўныя пазначэнні**: 1 — пясок; 2 — культурны слой; 3 — вуголле; 4 — попел шэрага колеру; 5 — моцна пракалены пясок; 6 — перакоп; 7, 8 — дзірван; 9 — мацярык (мал. М. А. Плавінскага)

***Раскоп I*** быў закладзены з мэтай даследавання *кургана 4*. Ён меў квадратную форму памерам 10 × 10 м і агульную плошчу 100 м² (мал. 5).

Курган 4 быў пакрыты густой лугавой травой і асобнымі папарацямі. Звонку ён выглядаў блізкім да паўсферычнага. Даўжыня насыпу па лініі поўнач—поўдзень — 9,2 м, захад—усход — 9,4 м, яго вышыня ў сённяшнім выглядзе — каля 0,7 м. На вяршыні насыпу прасочвалася аморфная западзіна памерам 2 × 2 м і глыбінёй да 0,1 м.

Вакол кургана — з паўночна-ўсходняга, паўночна-заходняга і паўднёва-заходняга бакоў прасочваліся раўчукі (мал. 5). Раўчук з паўночна-ўсходняга боку на ўзроўні сучаснай дзённай паверхні меў даўжыню 4,8 м, шырыню 1,8 м і глыбіню да 0,4 м. Разам з тым, варта адзначыць, што ўжо на ўзроўні сучаснай дзённай паверхні было заўважна, што ў межы паўночна-ўсходняга раўчука патрапіла больш позняя яміна, што было пацверджана ў далейшым у працэсе раскопак. Межы паўночна-заходняга раўчука прасочваліся адносна слаба. Верагодна, яго даўжыня дасягала не менш за 3,6 м, шырыня — 1,1 м, глыбіня — каля 0,15 м. Паўднёва-ўсходні раўчук таксама прасочваўся вельмі ўмоўна на даўжыню каля 5,2 м, шырыню — 1,7 м і глыбіню каля 0,2 м. Із паўднёва-ўсходняга боку раўчук на ўзроўні сучаснай дзённай паверхні не прасочваўся, бо тут у межы раскопа I патрапіў берагавы схіл Віліі (мал. 5).

Насып кургана 4 быў пакрыты слоем дзірвану магутнасцю 0,12—0,18 м (мал. 6). Ён складаўся з перамяшанага культурнага слою магутнасцю 0,5—0,65 м, які ўяўляў сабой светла-шэры пясок з асобнымі праслойкамі светлага пяску і пяску рознай ступені гумусаванасці. Усе праслойкі мелі аморфныя межы і плаўна пераходзілі адна ў адну. Відавочна, што такая стратыграфія магла ўтварыцца толькі ў тым выпадку, калі курган быў насыпаны з культурнага слою. У насыпе сустракаліся асобныя камяні памерам да 0,1 м.

Аснаванне кургана пакрываў слаба насычаны попельны слой з асобнымі дробнымі вугольчыкамі (памерам не больш за 1 см) магутнасцю 0,06—0,12 см. Можна ўпэўнена меркаваць, што гэты слой уяўляе сабой старажытны пахаваны дзірван.

Цэнтральная і паўночна-заходняя часткі насыпу былі пашкоджаны перакопам, дакладныя памеры якога вызначыць цяжка з прычыны таго, што яго запаўненне практычна не адрознівалася па колеры ад пераадкладзенага культурнага слоя, з якога складаўся насып (мал. 6). У раёне квадратаў 7 і 8 перакоп дайшоў да попельнай праслойкі на аснаванні кургана і нават пашкодзіў яе.

Курган змяшчаў пахаванне па абрадзе інгумацыі, якое было цалкам пашкоджана перакопам. Фактычна, ад пахавання захаваўся толькі пераадкладзены чэрап і ніжняя сківіца, якія былі выяўлены ў квадраце 8 (мал. 7: 1). Чэрап быў знойдзены на ўзроўні попельнага слоя на аснаванні кургана і змяшчаўся тварам уніз. Відавочна, што ён мог патрапіць у такое становішча толькі ў выніку перакопа. Побач з чэрапам, за 0,1 м на ўсход ад яго было выяўлена бранзалетападобнае скроневае колца, завязанае на адзін канец (мал. 7: 3). Выкарыстанне падобных колцаў магло працягвацца да пачатку XII ст. (Лесман 1984, с. 134; 1990, с. 69—70).

Ніякіх іншых парэшткаў касцяка выяўлена не было. Аднак, у квадраце 13 на ўзроўні попельнага слоя на аснаванні кургана быў знойдзены надзвычай моцна каразіраваны, захаваны ў чатырох фрагментах пярсцёнак са свінцова-алавяністага сплаву з авальнага ў сячэнні дроту дыяметрам 0,65 × 0,55 см (мал. 7: 4).

Із пахаваннем па абрадзе інгумацыі варта таксама звязаць развал кругавога гаршка, выяўлены ў насыпе кургана ў квадраце 13 на глыбіні 0,2—0,3 м ніжэй за ўзровень сучаснай




**Мал. 7.** Кастыкі 2016 г., курган 4 (раскоп I): 1 — пераадкладзеныя рэшткі пахавання па абрадзе інгумацыі; 2 — кругавы гарачок; 3 — скроневае колца; 4 — пярсцёнак (мал. М. А. Плавінскага)

дзённай паверхні (мал. 7: 2). Нажаль, стан стратыграфіі кургана не дазваляе ўпэўнена меркаваць, ці быў гаршчок першапачаткова змешчаны менавіта ў гэтым месцы, ці патрапіў сюды ў выніку перакопа. Посуд з падобнай прафілёўкай венца ў Полацку датуецца XI ст. (Штыхов 1975, с. 81). У сваю чаргу, у Навагрудку аналагічная кераміка была ў шырокім ужытку ў другой палове X ст., у меншай колькасці выкарыстоўвалася ў XI ст. і ў адзінкавых экзэмплярах сустракаецца ў комплексах першай паловы XII ст. (Малевская-Малевич 2005, с. 33). Улічваючы высокую якасць апрацоўкі гаршка з кургана 4 на ганчарным крузе, яго варта аднесці да развітага XI ці першай паловы XII ст.

Стан, у якім быў выяўлены чэрап і элементы пахавальнага інвентару, не дазваляе выказваць колькі-небудзь упэўненыя меркаванні аб арыентыроўцы пахавання па абрадзе інгумацыі. Можна толькі з вялікай асцярожнасцю лічыць, што яно было арыентаванае галавой на захад ці паўночны захад (мал. 7: 1).

На падставе захаванага інвентара, датаванне пахавання можа быць вызначана толькі ў шырокіх межах, сярэдзіны XI — пачатку XII ст. Прычым, ніжняя храналагічная мяжа з'яўляецца адносна ўмоўнай і адпавядае агульным акрэсленым рамкам функцыянавання некропаля, у той час як верхняя вызначаецца на падставе выяўлення бранзалетападобнага скроневага колца.

Аснаванне кургана мела абрысы, блізкія да акруглых (мал. 8: 1), хаця форма і стан захаванасці паўночнага раўчука не дазваляюць вызначыць памеры аснавання з поўнай упэўненасцю. Даўжыня аснавання па лініі поўнач—поўдзень дасягала прыкладна 6 м, захад—усход — каля 6 м.

Аснаванне кургана 4 было абкружана раўчукамі з паўночнага, паўночна-заходняга, паўднёва-заходняга і паўднёва-ўсходняга бакоў.

Паўночны раўчук меў даўжыню 6,7 м і глыбіню да 0,6—0,7 м (мал. 8). Вызначыць дакладную шырыню паўночнага раўчука не ўяўляец-




**Мал. 8.** Кастыкі 2016 г., курган 4 (раскоп I): 1 — план мацерыку; 2 — профілі раскопа (мал. М. А. Плавінскага)

ца магчымым з прычыны таго, што ён увайшоў у межы раскопа I толькі часткова, але, відавочна, што яна была большая за 2,2 м. У кв. 16 і 21 — ва ўсходняй частцы паўночнага раўчука быў выяўлены аб'ект — яміна, запоўненая сучасным будаўнічым смеццем (бітае шкло ад слоікаў, фрагмент вазона для кветак). Дно яміны з сучасным смеццем было забутаванае невялікімі камянямі памерам 0,1—0,2 м.

Паўночна-заходні раўчук увайшоў у межы раскопа I толькі часткова, што не дазваляе выказваць упэўненыя меркаванні аб яго памерах (мал. 8: 1). Глыбіня раўчука дасягала 0,5 м.

Паўднёва-заходні раўчук увайшоў у межы раскопа I толькі часткова (мал. 8: 1), але быў цалкам даследаваны ў раскопе II. Даўжыня раўчука, відавочна, была некалькі большай за 6,2 м, яго шырыня роўная 2,8—3 м, глыбіня дасягала 0,7—0,85 м. У верхняй частцы запаўнення раўчука меўся познасярэднявечны перакоп, які не прасочваўся стратыграфічна, але яго наяўнасць фіксавалася на падставе выяўлення развалу кругавога гаршка, пакрытага знутры карычневай палівай. Фрагменты гэтага ж гаршка былі таксама знойдзены ў кв. 8 раскопа II — у паўночна-заходняй частцы гэтага раўчука.

Вызначыць дакладныя памеры паўднёва-ўсходняга раўчука немагчыма з прычыны таго, што ён пашкоджаны іншым аб'ектам, магчыма, раўчуком іншага кургана (мал. 8: 1). Даўжыня паўднёва-ўсходняга раўчука была не большай за 4,8 м, яго шырыня дасягала 2,3 м, глыбіня — 0,35 м. Раўчук кургана 4 быў часткова перакрыты іншым аб'ектам — іншым раўчуком (?), размешчаным у квадратах 19—20, 24. Даўжыня гэтага раўчка (?) — 4,7 м, яго шырыня — 1,6—2,2 м, глыбіня — да 0,5 м. Цалкам верагодна, што гэты раўчук (?) мог належаць кургану, які быў калісці размешчаны на беразе Віліі, а пасля змыты яе водамі. Разам з тым, сцвярджаць, што прапанаваная інтэрпрэтацыя з'яўляецца адзінай магчымай і вернай, нельга, бо слядоў аснавання іншага кургана ў паўднёва-ўсходнім куце раскопа I выяўлена не было.

Запаўненне раўчукоў кургана 4 адрознівалася больш цёмным колерам, чым культурны слой пад насыпам і пераадкладзены слой, з якога складаўся курган. Акрамя таго, у запаўненні раўчукоў сустракаліся дробныя вугольчыкі.

З паўночна-заходняга боку ад кургана 4, у квадратах 2 і 7, былі выяўлены дзве вугальныя плямы і рэшткі вертыкальна ўсталяваных паралельна схілу кургана карбанізаваных плашак ці дошак таўшчынёй 2—3 см, якія захаваліся на даўжыню ад 0,16 да 0,4 м (мал. 8: 1). Аналагічныя дошкі знойдзены і з усходняга боку кургана ў кв. 17—19. Яны захаваліся на даўжыню 0,15—0,65 м і былі арыентаваныя пераважна паралельна паўднёваму схілу насыпа, хаця асобныя дошкі залягаюць у іншых накірунках. У кв. 18 на паўночным краі паўднёва-ўсходняга раўчука быў таксама выяўлены размешчаны вертыкальна карбанізаваны слуп дыяметрам 0,2 м. Нарэшце, рэшткі яшчэ адной карбанізаванай дошкі даўжынёй 0,3 м былі выяўлены ў квадраце 14.

Карбанізаваныя дошкі і слуп, размешчаныя паралельна схілам насыпа, могуць быць інтэрпрэтаваныя як рэшткі пэўнай драўлянай канструкцыі, якая была зроблена для ўмацавання схілаў кургана. Верагодна, гэтая канструкцыя складалася з дошак, якія змацоўваліся вертыкальна ці пад нахілам пры дапамозе вертыкальна ўкапаных слупоў. Размяшчэнне карбанізаваных дошак пацвярджае, што аснаванне курагана мела памер каля 6 м.

Рытуальныя дзеянні, ажыццёўленыя падчас узвядзення кургана 4, могуць быць рэканструяваныя наступным чынам. Пахаванне па абрадзе інгумацыі, верагодна, было змешчана на старажытнай дзённай паверхні. Разам з тым, стан захаванасці парэштак трупапакладання не дазваляе выказваць колькі-небудзь упэўненыя меркаванні аб асаблівасцях пахавальнага абраду. Пасля змяшчэння цела нябожчыцы на дзённую паверхню над ёй быў насыпаны курган, грунт для якога браўся з раўчукоў. Із мэтай умацавання схілаў насыпу кургана ад апаўзання па перыметры яго аснавання была збудавана канструкцыя з дошак ці плашак, якія ўтрымліваліся вертыкальна ўсталяванымі слупамі.

Пад насыпам кургана быў выяўлены культурны слой магутнасцю да 0,27—0,35 м, які ўяўляў сабой светла-шэры пясок, аналагічны насыпу кургана, які некалькі святлее бліжэй да мацерыку (мал. 6; 8: 2).Мацярык у раскопе I складаўся з жоўтага дробназярністага пяску (мал. 8: 1) і паніжаўся ў накірунку ад паўночна-заходняга да паўднёва-ўсходняга кута. Перапад вышыняў у гэтым накірунку складаў каля 0,5 м, што адпавядае агульнаму паніжэнню паверхні ў накірунку да берага Віліі.

У працэсе вывучэння пераадкладзенага культурнага слою, з якога быў насыпаны курган, і культурнага слою пад ім, была выяўлена дастаткова прадстаўнічая калекцыя індывідуальных і масавых знаходак.

*Індывідуальныя знаходкі з насыпа кургана 4.* У насыпе кургана 4 было выяўлена 7 індывідуальных знаходак — лязо нажа, цэлае і два фрагментаваныя праселакі і тры фрагменты тыгляў.

• Фрагмент ляза нажа знойдзены ў паўднёва-заходнім сектары на ўзроўні пахаванай глебы на аснаванні кургана (мал. 9: 1). Яго даўжыня — 7,3 см, шырыня ляза — 2,5 см, таўшчыня спінкі — 0,5 см.

• Цэлае глінянае біканічнае праселка выяўлена ў паўночна-ўсходнім сектары насыпа кургана. Вышыня праселка — 1,4 см, дыяметр — 2,3—2,4 см (мал. 9: 3).

• Фрагмент глінянага біканічнага праселка знойдзены ў насыпе, у яго паўднёва-заходнім




**Мал. 9.** Кастыкі 2016 г., курган 4 (раскоп І), індывідуальныя знаходкі: 1, 3, 4, 7, 9 — з пераадкладзенага культурнага слоя ў насыпе кургана; 2, 5, 6, 8 — з культурнага слоя пад насыпам (1 — лязо нажа; 2 — падвеска трапецападобная; 3—9 — праселкі біканічныя і іх фрагменты; мал. М. А. Плавінскага)




**Мал. 10.** Кастыкі 2016 г., курган 4 (раскоп І), індывідуальныя знаходкі: 1—2, 6 — з культурнага слоя пад насыпам; 3—5 — з пераадкладзенага культурнага слоя ў насыпе кургана (1 — абух каменнай шліфаванай свідраванай сякеры; 2—5 — фрагменты тыгляў; 6 — фрагмент глінянай ліцейнай формы; мал. М. А. Плавінскага)

сектары. Праселка мела вышыню 1,25 см, шырыня захаванага фрагмента — 2,2 см (мал. 9: 4).

• Другі фрагмент глінянага біканічнага праселка выяўлены ў паўднёва-заходнім сектары на ўзроўні пахаванай глебы на аснаванні кургана. Вышыня праселка — 1,3 см, шырыня захаванага фрагмента — 1,5 см (мал. 9: 9).

• Венца тыгля памерам 1,6 × 1,9 см знаходзілася ў паўночна-заходнім сектары насыпа (мал. 10: 3).

• Другое венца тыгля памерам 2,5 × 2 см выяўлена ў насыпе, у заходняй перамычцы (мал. 10: 4).

• Нарэшце, сценка тыгля памерам 3,1 × 3,6 см знаходзілася ў паўднёва-заходнім сектары на ўзроўні пахаванай глебы на аснаванні кургана (мал. 10: 5).

З пералічаных прадметаў адносна вузкае датаванне маюць толькі гліняныя біканічныя праселкі. Час найбольш шырокага распаўсюджання праселак дадзенага тыпу прыпадае на трэцюю чвэрць І тыс. н. э. (Митрофанов 1978, с. 114; Михайлова 2014, с. 159; Шадыра 2006, с. 80). У сваю чаргу, вузкае датаванне фрагментаў тыгляў, гэтаксама як і фрагмента ляза нажа, не падаецца магчымым. Разам з тым, лязо, мяркуючы па яго абрысах, з'яўляецца фрагментам масіўнага доўгага нажа, які можна лічыць прадметам узбраення.




**Мал. 11.** Кастыкі 2016 г., курган 4 (раскоп I): А, ляпная кераміка: 1—8 — позняга неаліту; 9—13 — пачатку эпохі бронзы (1—4, 6—8 — з культурнага слоя пад насыпам; 5, 7, 9—13 — пераадкладзенага культурнага слоя ў насыпе кургана; мал. С. С. Юрэцкага); В, ляпная кераміка жалезнага веку з пераадкладзенага культурнага слоя: 1—3, 5—8, 12 — ў насыпе кургана; 4, 9—12 — з культурнага слоя пад насыпам (1—11 — штрыхаваная кераміка; 12 — верхняя трэць чорнаглянцаванай пасудзіны; 1—4, 12 — мал. М. А. Плавінскага, 5—11 — мал. М. І. Сцяпанавай)

*Масавыя знаходкі з насыпа кургана 4.* Масавыя знаходкі з насыпа кургана 4 прадстаўленыя фрагментамі керамікі (пераважна дробнымі фрагментамі памерам 2 × 2, 3 × 3, 5 × 5 см), невялікай колькасцю крэмня са слядамі апрацоўкі, асобнымі кавалкамі металургічнага жужалю і кальцынаванымі косткамі. Агульная колькасць масавых знаходак, якія былі знойдзены ў пераадкладзеным культурным слаі ў нсыпе кургана, склала 287 адзінак.

Знойдзеныя фрагменты керамікі могуць быць падзеленыя на некалькі храналагічных перыядаў.

• Кераміка позняга неаліту (мал. 11: А: 5, 7).

• Кераміка пачатку эпохі бронзы (мал. 11: А: 9—13), сярод якой варта адзначыць развал з трох фрагментаў, якія належыць да тшцінецкага культурнага кола (мал. 11: А: 9) [1].

• Штрыхаваная кераміка (мал. 11: В: 1—3, 5—8), якая належыць да позняга этапу існаван-

1. Вызначэнне матэрыялаў позняга неаліту і бронзавага веку ажыццёўлена загадчыкам аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, к. г. н. С. С. Юрэцкім, за што аўтар прыносіць яму шчырую падзяку.

ня культуры і можа быць сукупна датаваная сярэдзінай І ст. да н. э. — ІІІ ст. н. э. (Егорейченко 2006, с. 111—112). Паводле меркавання А. М. Мядзведзева, выказанага ў 1996 г., пераход носьбітаў культуры штрыхаванай керамікі з гарадзішчаў на селішчы ў Беларускім Панямонні адбыўся ў першай палове ІІІ ст. н. э. (на трэцяй стадыі позняга этапу існавання культуры (Медведев 1996, с. 46)). Пазней даследчык перадатаваў гэтую стадыю і акрэсліў яе храналагічныя межы 150—250 гг. н. э. (Медведев 2011, с. 79).

• Адзінкавыя фрагменты глянцаванага посуду шэра-чорнага колеру (мал. 11: В: 12). Падобны посуд сустракаецца ў невялікай колькасці ў матэрыялах позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі (меў форму рабрыстых гаршкоў і місаў; Медведев 1996, с. 41; Митрофанов 1978, с. 38), але працягвае выкарыстоўвацца і ў ІІІ—V стст. н. э. (Лопатин, Фурасьев 2007, с. 17, 27, 30).

• Фрагменты грубай ляпной керамікі з дамешкам буйной некалібраванай жарствы, якія датуюцца трэцяй чвэрцю І тыс. н. э. і могуць быць упэўнена аднесены да банцараўскай археалагічнай культуры (мал. 12: 7—9, 11).

Варта адзначыць, што, нягледзячы на складанасць вызначэння і аднясення той ці іншай групы дробных фрагментаў ляпной керамікі да пэўнага храналагічнага перыяду, можна ўпэўнена меркаваць, што большая частка выяўленай у насыпе кургана 4 керамікі належыць да банцараўскай культуры.

*Індывідуальныя знаходкі з культурнага слою пад насыпам кургана 4.* У культурным слаі пад насыпам кургана было выяўлена 8 індывідуальных знаходак.

• Фрагмент глінянага біканічнага праселка (у паўночна-заходнім сектары). Праселка мела вышыню 1,45 см, шырыня захаванага фрагмента — 1,75 см (мал. 9: 7).

• Фрагмент глінянага біканічнага праселка (у квадраце 1). Вышыня фрагмента — 2,3 см, яго шырыня — 1,4 см (мал. 9: 8).

• Абух каменнай шліфаванай свідраванй сякеры (у квадраце 7). Яго вышыня — 3,2—3,6 см, даўжыня фрагмента — 3 см, шырыня — 4,3 см (мал. 10: 1).

• Фрагмент глінянай ліцейнай формачкі (у квадраце 11) памерам 2,4 × 2 і таўшчынёй 1,4 см. Формачка была зроблена з вельмі добра адмучанай гліны з дамешкам жарствы. Адзін яе бок зусім пляскаты, другі — некалькі выпуклы. Сляды літнікаў прасочваюцца на абодвух баках фрагмента, але яго памеры не дазваляюць выказваць пэўныя меркаванні аб характары ўпрыгажэнняў, для вырабу якіх яны прызначаліся (мал. 10: 6).

• Медная трапецападобная падвеска з пашкоджанымі ў выніку карозіі краямі (у квадраце 8). Наяўная вышыня падвескі — 3 см, наяўная шырыня — 2,9 см, таўшчыня — 0,04 см (мал. 9: 2).

• Сценка тыгля (у квадраце 8) вышынёй 4,8 см, шырынёй — 5,8 см і таўшчынёй 1,3—1,5 см (мал. 10: 2).

• Глінянае біканічнае праселка (у квадраце 14). Яго вышыня — 1 см, дыяметр — 2,4 см (мал. 9: 6).

• Глінянае біканічнае праселка (у квадраце 15). Яго вышыня — 1,2—1,3 см, дыяметр — 2,8 см (мал. 9: 5).

Сярод індывідуальных знаходак, якія былі выяўлены ў культурным слаі пад насыпам кургана 4, самай ранняй з'яўляецца абух каменнай шліфаванай свідраванай сякеры, які можа быць аднесены да эпохі бронзы ці ранняга жалезнага веку (І тыс. да н. э.; Егарэйчанка 1999, с. 131; Медведвев 1996, с. 24; 2011, с. 70). Астатнія артэфакты належаць да больш позняга часу. Разам з тым, вузкае датаванне сярод іх маюць толькі біканічныя праселкі трэцяй чвэрці І тыс. н. э. Трапецападобныя падвескі выкарыстоўваліся ў Беларускім Павіллі на працягу вельмі доўгага храналагічнага перыяду — ад позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі (Егорейченко 2006, с. 90; Медведев 1996, с. 29) да ранняга Сярэднявечча (Звяруга 2005, мал. 83: 7—8). Разам з тым, па сваіх прапорцыях знойдзеная падвеска бліжэй да экзэмпляраў позняга этапу культуры штрыхванай керамікі (Егорейченко 2006, с. 90, табл. 65: 16, 25), чым да ўзораў раннесярэднявечнага перыяду (Гавритухин 1997, рис. 1; Енуков 1990, рис. 13: 4, 8, 15: 21—29; Звяруга 2005, мал. 83: 7—8; 86: 9, 12). Да жалезнага веку ці трэцяй чвэрці І тыс. н. э. належыць і фрагмент ліцейнай формачкі.

*Масавыя знаходкі з культурнага слою пад насыпам кургана 4.* Масавыя знаходкі, знойдзеныя ў культурным слаі пад насыпам кургана 4, у цэлым аналагічныя тым, што былі выяўлены ў пераадкладзеным выглядзе ў насыпе. Тут таксама былі знойдзены крэмні са слядамі апрацоўкі, металургічны жужаль і кераміка ўсіх пералічаных вышэй храналагічных перыядаў. Агульная колькасць масавых знаходак склала 303 адзінкі.

• Кераміка позняга неаліту (мал. 11: А: 1—4, 6, 8).

• Кераміка пачатку эпохі бронзы.

• Штрыхаваная кераміка позняга этапу функцыянавання культуры штрыхаванай керамікі (мал. 11: В: 4, 9—11).

• Адзінкавыя фрагменты глянцаванага посуду чорна-шэрага колеру (мал. 11: В: 12)

• Фрагменты грубай ляпной керамікі з дамешкам буйной некалібраванай жарствы, якія належаць да банцараўскай культуры і датуюцца трэцяй чвэрцю І тыс. н. э. (мал. 12: 1—6, 10). Гэтаксама як і ў насыпе кургана, у слаі пад ім фрагменты банцараўскай культуры пераважаюць над экзэмплярамі іншых храналагічных груп.

У квадраце 9 быў выяўлены развал банцараўскай пасудзіны, на падставе якога атрымалася рэканструяваць яе верхнюю трэць,




**Мал. 12.** Кастыкі 2016 г., курган 4 (раскоп I), ляпная кераміка трэцяй чвэрці I тыс. н. э.: 1—6, 10 — з культурнага слоя пад насыпам; 7—9, 11 — з пераадкладзенага культурнага слоя ў насыпе (мал. М. А. Плавінскага)

мяркуючы па якой, дыяметр венца быў роўны 27 см (мал. 12: 1). Дадзены гаршок можа быць аднесены да тыпу 4 паводле М. У. Лапаціна і А. Г. Фурасьева (Лопатин, Фурасьев 2007, с. 36, рис. 17). Акрамя таго, ёсць магчымасць вызначыць дыяметр яшчэ чатырох банцараўскіх пасудзін. Дзве з іх мелі дыяметр па 10 см (мал. 12: 3, 5), яшчэ дзве — па 14 см (мал. 12: 2, 4).

Такім чынам, відавочна, што курган 4 быў насыпаны з культурнага слою паселішча, якое фунцыянавала ад эпохі позняга неаліту да трэцяй чвэрці I тыс. н. э.

***Раскоп II*** быў прырэзаны да раскопа I з заходняга боку (мал. 3; 5). Ён меў квадратную форму памерам 6 × 6 м і агульную плошчу 36 кв.м. Першапачатковай мэтай закладкі Раскопа II было вывучэнне невысокага ўзвышэння (вышынёй каля 0,2 м) у яго паўночнай і цэнтральнай частках, якое магло быць вельмі моцна знівеляваным насыпам кургана. У працэсе раскопак выявілася, што ўзвышэнне мела натуральны, а не штучны характар.

*Стратыграфія* дастаткова простая (мал. 13: 1). Пад слоем дзірвану магутнасцю да 0,08 м выяўлены культурны слой — аднародны светла-шэры пясок, аналагічны таму, што быў даследаваны пад насыпам кургана 4. Магутнасць культурнага слою дасягала 0,4—0,55 м. Ніякіх стратыграфічных праслоек ці аб'ектаў у слаі выяўлена не было.

Мацярык у раскопе II складаўся з жоўтага дробназярністага пяску (мал. 13: 1). У ім былі даследаваны два аб'екты — у квадратах 7 і 8 былі раскрыты паўночна-заходні край паўднёва-заходняга раўчука кургана 4. У паўднёвай частцы раскопа — у квадратах 3, 6 і 9 было даследавана іншае паглыбленне, якое, відавочна, уяўляе сабой два аб'екты — край усход-




**Мал. 13.** Кастыкі 2016 г., раскоп II: 1 — план мацерыку і профілі раскопа (шэрым колерам пазначаны развал ляпнога гаршка трэцяй чвэрці I тыс. н. э.); 2, 3 — ляпная кераміка трэцяй чвэрці I тыс. н. э.; 4, 5 — ляпная кераміка жалезнага веку (мал. М. А. Плавінскага)

няга раўчука кургана 5 і яшчэ адзін раўчук (?) змытага водамі Віліі кургана (?), арыентаваны па лініі поўдзень — поўнач, глыбінёй 0,3—0,35 м. Шырыню гэтага раўчука вызначыць немагчыма, бо ён увайшоў у межы раскопа II толькі часткова. Разам з тым, сцвярджаць, што ў паўднёвай частцы быў выяўлены менавіта раўчук, нельга. Не выключана і іншая інтэрпрэтацыя дадзенага аб'екта як перакрытага культурным слоем берагавога схіла Віліі.

*Масавыя знаходкі з культурнага слою раскопа II.* Індывідуальных знаходак выяўлена не было. Масавыя знаходкі былі прадстаўленыя амаль аднымі фрагментамі керамікі (усяго знойдзена 248 экзэмпляраў). Прычым, фрагменты посуду позняга неаліту і эпохі бронзы сустракаліся выключна рэдка, гэтаксама як і кавалкі крэменю са слядамі апрацоўкі, і фрагменты металічнага жужалю. Апроч таго, адзінкавымі фрагментамі быў прадстаўлены глянцаваны посуд чорнага колеру.

Адпаведна, кераміка можа быць падзеленая на дзве аноўныя храналагічныя групы.

• Штрыхаваная кераміка, якая належыць да позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі (мал. 13: 4—5).

• Грубая ляпная кераміка з дамешкам буйной некаліbраванай жарствы, якая датуецца трэцяй чвэрцю I тыс. н. э. і належыць да банцараўскай культуры (мал. 13: 3).

У квадратах 2 і 3 быў выяўлены развал вялікай ляпной слабапрафіляванай нераўнамерна абпаленай пасудзіны, зробленай з цеста з дамешкам буйной некаліbраванай жарствы памерам да 1 см (мал. 13: 2), якая належыць да тыпу 4 паводле М. У. Лапаціна і А. Г. Фурасьева і можа быць аднесена да банцараўскай культуры.

Шурфы I і II былі закладзеныя з мэтай паўторнага вывучэння насыпу *кургана 5* (мал. 3; 5; 14). Галоўнай мэтай закладкі гэтых шурфоў стала, у першую чаргу, вывучэнне методыкі раскопак Я. Г. Звяругі, выяўленне наяўнасці культурнага слоя пад насыпам кургана і перспектыў яго даследавання. Перад пачаткам раскопак 2016 г. курган 5 выглядаў паўсферычным (мал. 5, 14). Яго даўжыня па лініі поўнач — поўдзень дасягала 10 м, па лініі захад—усход — 11 м (першапачатковы дыяметр, паводле Я. Г. Звяругі — 10,2 м), вышыня — 0,65—0,7 м (першапачатковая вышыня — 1,4 м).

***Шурф I*** быў закладзены ў паўднёва-ўсходняй частцы насыпу кургана 5. Ён меў прамавугольную форму, выцягнутую з захаду на ўсход, памерам 6 × 4 м (мал. 3; 5; 14).

У працэсе раскопак было выяўлена, што сучасная будова насыпу ўтварылася ў выніку яго




**Мал. 14.** Кастыкі 2016 г., курган 5 (шурфы I і II), план дзённай паверхні ў гарызанталях, гарызанталі праведзены праз 0,05 м (мал. В. А. Макоўскай)

аднаўленне па завяршэнні раскопак 1973 г. (мал. 15: 1, 2). Курган быў пакрыты слоем дзірвану магутнасцю 0,1—0,18 м, насып пад якім дасягаў магутнасці да 0,5 м і складаўся з аморфных хаатычна размешчаных праслоек перамяшанага культурнага слою светла-шэрага колеру і пяску рознай ступені перамяшанасці і розных адценняў шэрага. Такія праслойкі маглі ўтварыцца толькі ў выніку аднаўлення насыпу з грунту, узятага з адвала.

Пад аднаўленым насыпам месцамі прасочваўся слаба насычаны попельны слой з асобнымі дробнымі вугольчыкамі памерам не больш за 1 см. Магутнасць гэтага слою — слою пахаванага дзірвану, які, верагодна, не быў цалкам даследаваны ў 1973 г., — дасягала 0,05—0,08 м. Пад слоем пахаванага дзірвану быў выяўлены культурны слой — аднародны светла-шэры пясок магутнасцю да 0,45 м, які не падвяргаўся раскопкам у 1973 г. (мал. 15: 1—3).

Мацярык у шурфе I складаўся з жоўтага дробназярністага пяску (мал. 15: 3). Ва ўсходняй частцы шурфа — у квадратах 3, 4, 5 і 6 быў выяўлены паўднёвы край усходняга раўчука кургана 5. Шырыня раўчука дасягала 3,3 м (яго ўсходні край выяўлены ў квадраце 3 раскопа II).

У пераадкладзеным слаі ў насыпе кургана былі выяўленыя асобныя фрагменты познасярэднявечнага кругавога посуду (мал. 15: 9) і дзве жалезныя скабы. У сваю чаргу, у культурным слаі пад курганам знойдзеныя фрагменты керамікі позняга неаліту і пачатку эпохі бронзы, фрагменты посуду позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі (мал. 15: 4—6), фрагменты глянцаванай керамікі чорна-шэрага




**Мал. 15.** Кастыкі 2016 г., курган 5 (шурф I): 1 — паўднёвы профіль кургана; 2 — усходні профіль кургана; 3 — план мацерыку і профілі шурфа; 4—6 — ляпная кераміка жалезнага веку; 7, 8 — ляпная кераміка трэцяй чвэрці I тыс. н. э.; 9 — частковая графічная рэканструкцыя кругавога гаршка (мал. М. А. Плавінскага)

 ISSN 2227-4952. Археологія і давня історія України, 2020, вип. 2 (35)




**Мал. 16.** Кастыкі 2016 г., курган 5 (шурф II): 1 — паўночны профіль кургана; 2 — план мацерыку і профілі шурфа; 3—6 — ляпная кераміка жалезнага веку; 7, 9 — ляпная кераміка трэцяй чвэрці I тыс. н. э., 8 — венца кругавога гаршка (1—2, 9 — мал. М. А. Плавінскага, 3—8 — мал. М. І. Сцяпанавай)

колеру, фрагменты посуду банцараўскай культуры (мал. 15: 7—8). Асаблівасцю асартымента керамікі ў шурфе I — у культурным слаі пад насыпам кургана, у параўнанні з раскопамі I і II, з'яўляецца вялікая колькасць фрагментаў посуду позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі (36 адзінак з 68).

***Шурф II*** быў закладзены ў паўночна-ўсходняй частцы кургана 5. Ён меў квадратную форму памерам 4 × 4 м і агульную плошчу 16 м$^2$ (мал. 3; 5; 14).

Стратыграфія насыпа кургана 5 у шурфе II не адрозніваецца ад стратыграфіі ў шурфе I. Мацярык складаўся з жоўтага дробназярністага пяску (мал. 16: 1—2). У шурфе быў выяўлены ўчастак усходняга раўчука кургана 5, шырыня якога дасягала 2 м.

У культурным слаі пад насыпам знойдзены пераважна фрагменты банцараўскай керамікі (мал. 16: 7, 9). Сярод іх варта адзначыць развал слабапрафіляванага гаршка з цеста карычневага колеру з дамешкам буйной некалібраванай жарствы дыяметрам да 0,7 см (мал. 16: 9), які можна аднесці да тыпу 4 паведле М. У. Лапаціна і А. Г. Фурасьева. Дастаткова прыкметную частку выяўленых фрагментаў складаюць кавалкі посуду позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі (мал. 16: 3—6). Акрамя таго, знойдзеныя адзінкавыя фрагменты глянцаванага посуду чорна-шэрага колеру і кругавога




**Мал. 17.** Кастыкі 2018 г., шурф III, план мацерыку і профілі шурфа (мал. М. А. Плавінскага)

посуду (мал. 16: 8). Агульная колькасць выяўленых у шурфе II фрагментаў керамікі склала 44 адзінкі.

Такім чынам, у працэсе раскопак 2016 г. было вызначана, што пахавальныя насыпы старажытнарускага курганнага могільніка ўзводзіліся на месцы адкрытага паселішча Кастыкі II. У культурным слаі пад курганамі і ў міжкурганнай прасторы, а таксама ў пераадкладзеным культурным слаі, з якога складаюцца пахавальныя насыпы, былі выяўлены матэрыялы позняга неаліту і пачатку эпохі бронзы, посуд позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі і, верагодна, другой чвэрці I тыс. н. э., а таксама рэчавы і керамічны наборы, характэрныя для банцараўскай культуры трэцяй чвэрці I тыс. н. э. Пры гэтым, банцараўскія матэрыялы цалкам пераважаюць у складзе керамічнай калекцыі, сабранай падчас раскопак 2016 г. Адпаведна, можна меркаваць, што гаспадарчая актыўнасць на ўчастку адкрытага паселішча Кастыкі II, на якім былі закладзеныя раскопы і шурфы 2016 г., верагодна, найбольш актыўна ажыццяўлялася менавіта ў трэцяй чвэрці I тыс. н. э.

***Шурф III*** быў закладзены ў 2018 г. у заходняй частцы тэрыторыі некропаля на паўночны ўсход ад кургана 9 і, адпаведна, на паўднёвы захад ад кургана 8 (мал. 3). Шурф III быў закладзены з мэтай вызначэння межаў распаўсюджання і стратыграфічных асаблівасцяў культурнага слою адкрытага паселішча Кастыкі II. Ён меў прамавугольную форму, выцягнутую па лініі поўнач — поўдзень, памерам 6 × 2 м і агульную плошчу 12 м² (мал. 3).

Стратыграфія шурфа III дастаткова простая (мал. 17). Пад слоем дзірвану магутнасцю да 0,04—0,06 м быў выяўлены слой шэрага гумуса таўшчынёй 0,14—0,35 м. У паўночнай, цэнтральнай і паўднёва-заходняй частках шурфа пад гэтым слоем прасочваўся перадмацерыковы слой — светла-шэры пясок з уключэннем пяску магутнасцю ад 0,22 да 0,04 м, які пасту-




**Мал. 18.** Кастыкі 2018 г., шурф III, ляпная кераміка: 1—8 — штрыхаваная; 9 — чорнаглянцаваная; 10 — з расчосамі (мал. М. І. Сцяпанавай)

пова святлеў бліжэй да мацерыку. Мацярык складаўся з жоўтага дробназярністага пяску.

У працэсе вывучэння культурнага слою ў шурфе III была сабраная калекцыя масавых знаходак, якая налічвае 45 адзінак і ўключае крэмень са слядамі апрацоўкі, металургічны жужаль, фрагменты ляпнога (мал. 18) і кругавога посуду. Выключную цікаваць уяўляе знаходка сценкі ляпной пасудзіны з расчосамі (мал. 18: 10), якая датуецца III—V стст. і належыць да старажытнасцяў кола Заазер'е-Узмень, якія генетычна звязаныя з кіеўскай культурай ці, нават, разглядаюцца, як своеасаблівы заходнедзвінскі варыянт кіеўскай культурна-гістарычнай супольнасці (Лопатин, Фурасьев 2007, с. 90—91). Выяўленне дадзенага артэфакта з'яўляецца дадатковым сведчаннем таго, што адкрытае паселішча Кастыкі II працягвала функцыянаваць і ў другой чвэрці I тыс. н. э.

Нягледзячы на невялікую плошчу шурфа III, можна адзначыць, што ў складзе выяўленай у ім керамічнай калекцыі значнае месца складаюць фрагменты ляпнога штрыхавага посуду позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі — не менш за 19 адзінак (мал. 18: 1—8). Акрамя таго, знойдзена пяць фрагментаў ляпной чорнай глянцаванай керамікі (мал. 18: 9). Дадзены факт дазваляе ўзняць пытанне аб магчымасці вызначэння ў будучым асаблівасцяў прасторавага развіцця адкрытага паселішча Кастыкі II. Маецца на ўвазе тое, што калі ў паўднёва-заходняй частцы сучаснай тэрыторыі могільніка, у раскопах і шурфах 2016 г., большая частка выяўленых матэрыялаў належыць да трэцяй чвэрці I тыс. н. э., дык у шурфе III фіксуецца перавага керамікі першых стагоддзяў нашай эры. Разам з тым, адносна невялікая плошча, даследаваная на працягу 2016 і 2018 гг., дазваляе разглядаць дадзенае меркаванне толькі ў якасці рабочай гіпотэзы, якая патрабуе верыфікацыі ў працэсе далейшых палявых даследаванняў.

**Высновы.** На падставе аналізу матэрыялаў раскопак 1973, 2016 і 2018 гг., можна ўпэўнена меркаваць, што шматкультурнае паселішча Кастыкі II у вярхоўях Віліі функцыянавала напрацягу доўгага часу. У культурным слаі пад курганамі і ў міжкурганнай прасторы, а таксама ў пераадкладзеным культурным слаі, з якога складаюцца насыпы, знойдзены матэрыялы позняга неаліту і пачатку эпохі бронзы, посуд позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі і другой чвэрці I тыс. н. э., а таксама рэчавы і керамічны наборы, характэрныя для банцараўскай культуры трэцяй чвэрці I тыс. н. э.

Варта адзначыць, што, нягледзячы на адносна невялікі аб'ём праведзеных даследаванняў, сам факт вывучэння адкрытага паселішча з напластаваннямі позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі і банцараўскай культуры ўяўляе відавочную навуковую цікавасць, бо на тэрыторыі Беларусскага Павілля такія селішчы, не прылеглыя да гарадзішчаў, дагэтуль практычна не раскопваліся.

## ЛІТАРАТУРА

Гавритухин, И. О. 1997. Маленькие трапециевидные подвески с полоской из прессованных точек по нижнему краю. *Гістарычна-археалагічны зборнік*, 12, с. 43-53.

Егарэйчанка, А. А. 1999. Культура штрыхаванай керамікі. У: Шадыра, В. І., Вяргей, В. С. (рэд.). *Археалогія Беларусі у 4 т.* 2: Жалезны век і ранняе сярэднявечча. Мінск: Беларуская навука, с. 113-173.

Егорейченко, А. А. 2006. *Культуры штрихованной керамики.* Минск: БГУ.

Енуков, В. В. 1990. *Ранние этапы формирования смоленско-полоцких кривичей (по археологическим данным).* Москва: КГПУ.

Зверуго, Я. Г. 1974. *Отчет о полевых исследованиях верхненеманского отряда Белорусской археологической экспедиции в 1973 г.* ФАНД ЦНА НАН Беларусі, спр. 449.

Зверуго, Я. Г. 1989. *Верхнее Понеманье в IX—XIII вв.* Минск: Наука и техника, 1989.

Звяруга, Я. Г. 2001. Даследаванні курганных могільнікаў у вярхоўях Віліі. *Матэрыялы па археалогіі Беларусі*, 3, с. 173-186.

Звяруга, Я. Г. 2005. *Беларускае Павілле ў жалезным веку і ранім сярэдневякоўі.* Мінск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Матэрыялы па археалогіі Беларусі, 10.

Лесман, Ю. М. 1984. Погребальные памятники Новгородской земли и Новгород (проблема синхронизации). В: Лебедев, Г. С. (ред.). *Археологические исследования Новгородской земли.* Ленинград: ЛГУ, с. 118-182.

Лесман, Ю. М. 1990. Хронология ювелирных изделий Новгорода (X—XIV вв.). *Материалы по археологии Новгорода 1988*, с. 29-98.

Лопатин, Н. В., Фурасьев, А. Г. 2007. *Северные рубежи раннеславянского мира в III—V вв.* Москва: ИА РАН. Раннеславянский мир, 8.

Малевская-Малевич, М. В. 2005. *Керамика западнорусских городов X—XIII вв.* Санкт-Петербург: Нестор-История.

Медведвев, А. М. 1996. *Белорусское Понеманье в раннем железном веке (I тысячелетие до н. э. — 5 в. н. э.).* Минск: Институт истории НАН Беларуси.

Медведвев, А. М. 2011. *Верхнее Понеманье в железном веке и раннем средневековье.* Минск: Беларуская навука.

Митрофанов, А. Г. 1978. *Железный век средней Белоруссии (VII—VI вв. до н. э. — VIII в. н. э.).* Минск: Наука и техника.

Михайлова, Е. Р. 2014. *Вещевой комплекс культуры псковских длинных курганов*: *типология и хронология.* Saarbrücken.

Мядзведзеў, А. М. 1996. Аб храналогіі помнікаў культуры штрыхаванй керамікі ў I—V стст. н. э. (па матэрыялах Панямоння). *Із глыбі вякоў*: *Наш край*: *Гістарычна-культуралагічны зборнік*, 1, с. 50-57.

Плавінскі, М. А. 2017а. Асноўныя вынікі даследаванняў археалагічнай экспедыцыі Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А. Д. Сахарава Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. В: *Материалы 17-й международной научной кон-*

ференции, 18—19 мая 2017 г.: Сахаровские чтения 2017 года: экологические проблемы XXI века. Минск, 1, с. 28-29.

Плавінскі, М. А. 2017b. *Курганны могільнік Пагошча ў кантэксце сінхронных старажытнасцяў Браслаўскага Паазер'я.* Мінск: А. М. Янушкевіч.

Плавінскі, М. А., Сцяпанава, М. І. 2019. *Комплекс археалагічных помнікаў Кастыкі ў вярхоўях Віліі.* Мінск: Мінфіна.

Чарняўскі, М. М. 2006. Паселішча Кастыкі 1 на Віліі. *Гістарычна-археалагічны зборнік*, 22, с. 31-38.

Шадыра, В. І. 1999. Банцараўская культура. У: Шадыра, В. І., Вяргей, В. С. (рэд.). *Археалогія Беларусі у 4 т.* 2: Жалезны век і ранняе сярэднявечча. Мінск: Беларуская навука, с. 359-376.

Шадыра, В. І. 2006. *Беларускае Падзвінне (І тысячагоддзе н. э.).* Мінск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі.

Штыхов, Г. В. 1975. *Древний Полоцк (IX—XIII вв.).* Минск: Наука и техника.

Pławinski, M. 2017. Badania cmentarzysk kurhanowych w Nawrach i Kostykach nad górną Wilią w 2016 roku. *Badania archeologiczne w Polsce środkowowschodniej, zachodniej Białorusi i Ukrainie w roku 2016*: *streszczenia referatów XXXIII konferencji*, s. 40-41.

Tyszkiewicz, K. 1871. *Wilija i jej brzegi*: *pod względem hydrograficznym*, *historycznym*, *archeologicznym i etnograficznym.* Drezno: Drukiem i nakladem J. I. Krazsewskiego.

## REFERENCES

Gavritukhin, I. O. 1997. Malen'kiye trapetsiyevidnyye podveski s poloskoy iz pressovannykh tochek po nizhnemu krayu. *Histaryčna-archiealahičny zbornik*, 12, s. 43-53.

Jeharejčanka, A. A. 1999. Kuĺtura štrychavanaj kieramiki. U: Šadyra, V. I., Viarhiej, V. S. (eds.). *Archiealohija Bielarusi*: *u 4 t.* 2: Žaliezny viek i ranniaje siaredniaviečča. Minsk: Bielaruskaja navuka, s. 113-173.

Yegoreychenko, A. A. 2006. *Kul'tury shtrikhovannoy keramiki.* Minsk: BGU.

Yenukov, V. V. 1990. *Ranniye etapy formirovaniya smolenskopolotskikh krivichey (po arkheologicheskim dannym).* Moskva: KGPU.

Zverugo, J. G. 1974. *Otchet o polevykh issledovaniyakh verkhnenemanskogo otryada Belorusskoy arkheologicheskoy ekspeditsii v 1973 g.* FAND CNA NAN Bielarusi, spr. 449.

Zverugo, J. G. 1989. *Verkhneye Poneman'ye v IX—XIII vv.* Minsk: Nauka i tekhnika, 1989.

Zviaruha, J. H. 2001. Dasliedavanni kurhannych mohiĺnikaŭ u viarchoŭjach Vilii. *Materyjaly pa archiealohii Bielarusi*, 3, s. 173-186.

Zviaruha, J. H. 2005. *Bielaruskaje Pavillie ŭ žalieznym vieku i rannim siarednieviakoŭi.* Minsk: Instytut historyi NAN Bielarusi. Materyjaly pa archiealohii Bielarusi, 10.

Lesman, YU. M. 1984. Pogrebal'nyye pamyatniki Novgorodskoy zemli i Novgorod (problema sinkhronizatsii). In: Lebedev, G. S. (ed.). *Arkheologicheskiye issledovaniya Novgorodskoy zemli.* Leningrad: LGU, s. 118-182.

Lesman, YU. M. 1990. Khronologiya yuvelirnykh izdeliy Novgoroda (X—XIV vv.). *Materialy po arkheologii Novgoroda 1988*, s. 29-98.

Lopatin, N. V., Furas'yev, A. G. 2007. *Severnyye rubezhi ranneslavyanskogo mira v III—V vv.* Moskva: IA RAN. Raneslavyanskiy mir, 8.

Malevskaya-Malevich, M. V. 2005. *Keramika zapadnorusskikh gorodov X—XIII vv.* Sankt-Peterburg: Nestor-Istoriya.

Medvedvev, A. M. 1996. *Belorusskoye Poneman'ye v rannem zheleznom veke (Í tysyacheletiye do n.e. — 5 v. n.e.).* Minsk: Institut istorii NAN Belarusi.

Medvedvev, A. M. 2011. *Verkhneye Poneman'ye v zheleznom veke i rannem srednevekov'ye.* Minsk: Belaruskaya navuka.

Mitrofanov, A. G. 1978. *Zheleznyy vek sredney Belorussii (VII—VI vv. do n. e. — VIII v. n. e.).* Minsk: Nauka i tekhnika.

Mikhaylova, E. R. 2014. *Veshchevoy kompleks kul'tury pskovskikh dlinnykh kurganov*: *tipologiya i khronologiya.* Saarbrücken.

Miadzviedzieŭ, A. M. 1996. Ab chranalohii pomnikaŭ kuĺtury štrychavanj kieramiki ŭ I—V stst. n. e. (pa materyjalach Paniamonnia). *Z hlybi viakoŭ*: *Naš kraj*: *Histaryčna-kuĺturalahičny zbornik*, 1, s. 50-57.

Plavinski, M. A. 2017a. Asnoŭnyia vyniki dasledavanniaŭ arkhealagichnai ekspedytsyi Mizhnarodnaga dziarzhaŭnaga ekalagichnaga instytuta imia A. D. Sakharava Belaruskaga dziarzhaŭnaga ŷniversiteta. In: *Materialy 17-i mezhdunarodnoi nauchnoi konferentsii, 18—19 maia 2017 g.*: Sakharovskie chteniia 2017 goda: ekologicheskie problemy XXI veka. Minsk, 1, s. 28-29.

Plavinski, M. A. 2017b. *Kurhanny mohiĺnik Pahošča ŭ kantekscie sinchronnych staražytnasciaŭ Braslaŭskaha Paazierja.* Minsk: A. M. Januškievič.

Plavinski, M. A., Sciapanava, M. I. 2019. *Komplieks archiealahičnych pomnikaŭ Kastyki ŭ viarchoŭjach Vilii.* Minsk: Minfina.

Čarniaŭski, M. M. 2006. Pasielišča Kastyki 1 na Vilii. *Histaryčna-archiealahičny zbornik*, 22, s. 31-38.

Šadyra, V. I. 1999. Bancaraŭskaja kuĺtura. U: Šadyra, V. I., Viarhiej, V. S. (eds.). *Archiealohija Bielarusi*: *u 4 t.* 2: Žaliezny viek i ranniaje siaredniaviečča. Minsk: Bielaruskaja navuka, s. 359-376.

Šadyra, V. I. 2006. *Bielaruskaje Padzvinnie (I tysiačahoddzie n. e.).* Minsk: Instytut historyi NAN Bielarusi.

Shtykhov, G. V. 1975. *Drevniy Polotsk (IX—XIII vv.).* Minsk: Nauka i tekhnika.

Pławinski, M. 2017. Badania cmentarzysk kurhanowych w Nawrach i Kostykach nad górną Wilią w 2016 roku. *Badania archeologiczne w Polsce środkowowschodniej, zachodniej Białorusi i Ukrainie w roku 2016*: *streszczenia referatów XXXIII konferencji*, s. 40-41.

Tyszkiewicz, K. 1871. *Wilija i jej brzegi*: *pod względem hydrograficznym, historycznym, archeologicznym i etnograficznym.* Drezno: Drukiem i nakladem J. I. Krazsewskiego.

*М. О. Плавінскі*

## БАГАТОКУЛЬТУРНЕ ПОСЕЛЕННЯ КАСТИКІ ІІ В ВЕРХІВ'ЯХ ВІЛІЇ: МАТЕРІАЛИ ДОСЛІДЖЕНЬ 1973 2016 І 2018 рр.

Поселення Кастикі ІІ є частиною комплексу археологічних пам'яток Кастикі, розміщеного у східній частині с. Кастикі Людвіноуської сільської ради Вілейського р-ну Мінської обл., який також включає в себе курганний могильник середини 11—12 ст. Комплекс археологічних пам'яток розміщується на правому березі Вілії за 2,5 км до впадіння в неї р. Сервач.

Перші розкопки в Кастиках провів К. Тишкевич. Він досліджував тут один пошкоджений курган, який не містив ні поховання, ні інвентарю. У 1973 р. Я. Зваруга зняв план некрополя і досліджував сім насипів. У 2016 р. М. О. Плавінскі відновив розкопки в Кастиках. У результаті розкрито загальну площу 166 м$^2$, вивчено курган 4 і досліджено культурний шар поселення. У 2018 р. з метою уточнення меж поширення культурного шару і його датування був додатково закладено шурф площею 12 м$^2$. Матеріали розкопок курганів свідчать, що вони належали групі жителів Полоцької землі, які здійснювали поховання за обрядом ингумации на основі насипів, орієнтовані головами на захід. Це, в свою чергу, вказує на те, що давньоруський колектив, який зали-

шив некрополь в Кастиках, мав певне уявлення про християнському поховальному обряді.

Аналіз матеріалів розкопок 1973, 2016 і 2018 рр. дозволяє встановити, що багатокультурне поселення Кастикі II функціонувало протягом тривалого часу. У культурному шарі під курганами, в межкурганном просторі, також як і в перевідкладеному культурному шарі, з якого складаються кургани, були знайдені матеріали пізнього неоліту і початку епохи бронзи, кераміка пізнього етапу культури штрихованої кераміки і другої чверті I тис. н. е., а також речовий і керамічний набори, характерні для банцараускай культури третьої чверті I тис. н. е.

Не дивлячись на відносно невеликі обсяги проведених досліджень, сам факт виявлення відкритого поселення з нашаруваннями пізнього етапу культури штрихованої кераміки і банцараускай культури представляє очевидну наукову цінність, так як на території Білоруського Павілля такі селища, які не прилягають до городищ, до цих пір практично не розкопувалися.

**Ключові слова**: багатокультурне поселення, пізній етап культури штрихованной кераміки, банцарауская культура.

*M. A. Plavinski*

## MULTICULTURAL SETTLEMENT KASTYKI II IN THE VILIJA UPPER REACHES: RESEARCHES OF 1973, 2016 AND 2018

Kastyki II settlement is the part of the complex of archaeological monuments located in the eastern part of the village Kastyki of Lyudvinova village council, Vileika district, Minsk region. It also includes the barrow cemetery of the mid-11th—12th centuries. The complex of archaeological monuments is located on the right bank of Vilija in 2.5 km from the confluence of Servač River.

The first excavations at Kastyki were made by K. Tyshkevich who unearthed here one damaged mound which did not contain any burial and equipment. In 1973 J. Zviaruha made a plan of the necropolis and discovered 7 burial mounds in it. In 2016 M. A. Plavinski resumed excavations at Kastyki. As a result total area of 166 m$^2$ was excavated, mound 4 was excavated, and the cultural layer of the settlement was explaned. In 2018 in order to clarify the limits of distribution of the cultural layer and its dating the pit of 12 m$^2$ was additionally excavated.

Materials from the excavation of the burial mounds suggest that belonged to a group of residents of the Polotsk land who made burials according to the rite of inhumation on the basis of burial mounds with their heads directed to the west. This, in turn, suggests that the members of the Old Rus community, which left the necropolis in Kastyki, had a certain understanding of the Christian burial rites.

Analysis of materials excavated in 1973, 2016 and 2018 allows to determine that the multicultural settlement of Kastyki II functioned for a long time. In the cultural layer under the mounds, in the intermound space, as well as in the reworked cultural layer which mounds consist of, the materials of the late Neolithic period and the early Bronze Age, vessels of the late hatched pottery culture and the second quarter of the 1st millennium AD, artifacts and pottery sets characteristic for the third quarter 1st millennium AD have been discovered.

Despite the relatively small area of the excavations the fact of discovery of the settlement with the late layers of Hatched pottery culture and Bantserovshchina culture is of real scientific value, since such settlements, not adjacenting to the hill forts, have not been unearthed on the territory of Belarusian Vilija Region.

**Keywords:** multicultural settlement, late Hatched pottery culture, Bantserovshchina culture.

*Одержано 23.09.2019*

**ПЛАВІНСКІ Миколай Олександрович**, кандидат історичних наук, доцент, завідувач кафедрою, Білоруський державний університет, вул. Далгабродська 23, Мінск, 22070, Білорусь.

**PLAVINSKI Mikalai A.**, Candidate of Historical Sciences, Assistant Professor, Head of Department, the Belarusian State University, Dalhabrodskaja str., 23, Minsk, 220070, Belarus.

ORCID: 0000-0002-0660-7298;

e-mail: plavinsky_arc@mail.ru.